ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (817) ● Чацвер, 10 чэрвеня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV



СЕСІЯ



СЕСІЯ

*НА ЗДЫМКАХ: экзамен па крымінальнаму праву ў студэнта III курса юрфака А. Арабея прымае дацэнт С. П. Бякешка: (справа) экзамен па дыферэнцыяльных ураўненнях здае студэнт II курса фізфака В. Будрык, экзаменуе кандыдат фізіка-матэматычных навук У. В. Амелькін.*

Фота *Д. Чаховіча.*

## ЭКЗАМЕНЫ ПАЧАЛІСЯ

На хімічным факультэце пачалося падвядзенне вынікаў навучання на дзённым і вячэрнім аддзяленнях. Днямі дзяржаўная экзаменацыйная камісія пад старшынствам доктара хімічных навук В. С. Салдатава прымала экзамен па неарганічнай хіміі.

Узросшыя патрабаванні вызначылі ўвесь ход экзаменаў. Многія студэнты паказалі глыбокія тэарэтычныя веды, разуменне ролі хіміі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР. Выдатна адказвалі студэнткі В. Данілава, Т. Крачына. Справа-задача пяцікурснікаў працягваецца.

**Л. ГАЎРЫЛАВА,**
**студэнтка журфака.**

## ВЫКОНВАЮЧЫ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

**СТУДЭНТЫ і выкладчыкі фізічнага факультэта ў гэтым годзе ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя універсітэта. Сёння можна ўжо падвесці некаторыя вынікі. Навучальны год факультэт закончыў здавальняюча. Вучэбны план выканан поўнасцю. Закончылася заліковая сесія, і студэнты прыступілі да здачы пераводных экзаменаў.**

**Заліковая сесія паказала, што асноўная маса студэнтаў факультэта на працягу года працавала добрасумленна і ўзятыя абавязацельствы выканала.**

**Паспяхова здалі дзяржаўны экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі пяцікурснікі. Большасць выпускнікоў (больш 85 працэнтаў) атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі. Трэцякурснікі экзаменаваліся па палітэканоміі. Выкладчык дацэнт І. Т. Рагоўскі з задавальненнем адзначыў, што ў гэтым годзе студэнты факультэта добра падрыхтаваліся. Каля 50 працэнтаў студэнтаў атрымалі толькі выдатныя адзнакі. З 364 экзаменаваных па палітэканоміі толькі 2 студэнты (Рубан, Ройтблат) атрымалі нездавальняючыя адзнакі, 17 — здавальняючыя, а астатнія—добрыя і выдатныя.**

**455 студэнтаў-радыёфізікаў III і IV курсаў абаранілі курсавыя работы. З іх больш 90 працэнтаў—на выдатна і добра, частка работ прадстаўлена на конкурс. Студэнты 2, 4, 9 груп III курса паспяхова здалі экзамены па метадах матэматычнай фізікі і электрадынаміцы, а 11, 12, 14 і 15 групы чацвёртакурснікаў—па спецкурсах. Усе студэнты гэтых груп у асноўным атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. Выдатную падрыхтоўку паказалі студэнты Б. Лютарэвіч, В. Цялегін, Г. Стакроцкі, Ю. Сакалоў (II курс), Н. Данчанка, А. Жыхар, Д. Царук, В. Апанасевіч і іншыя (III курс), В. Караткевіч, В. Магільны і іншыя (IV курс). Лепшая паспяховасць у параўнанні з зімовай экзаменацыйнай сесіяй у першакурснікаў.**

**Пакуль што лепшай падрыхтаванасцю да экзаменаў выдзяляюцца III, IV і II курсы радыёфізікаў. Некалькі горш падрыхтаваліся і выконваюць свае абавязацельствы першакурснікі другога патоку і II курс аддзялення фізікі.**

**Ёсць і такія студэнты, якія хранічна не паспяваюць, цягнуць назад свае групы і курсы. Гэта О. Вараб'ёў, Г. Алтынаў, А. Кухарчык, В. Свердлікаў, Ф. Пячкураў, С. Хлебавец і іншыя. Яны мала працуюць над зададзеным матэрыялам на працягу семестра, прапускаюць заняткі без уважлівых прычын і як вынік—пастаянна атрымліваюць двойкі на экзаменах.**

**Мяркуючы па першых выніках, можна спадзявацца, што пераважная большасць студэнтаў сесію здасць паспяхова і выканае свае сацыялістычныя абавязацельствы.**

**Я. ПІСКУНОЎ.**

## ВЕСТКІ З ПАДРЫХТОЎЧАГА

На падрыхтоўчым факультэце адбыліся заключныя заняткі палітсемінара выкладчыкаў і супрацоўнікаў па праблемах краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Кіраўнік прафесар В. Р. Заўрыеў падвёў вынікі работы ўдзельнікаў палітсемінара і падкрэсліў неабходнасць у будучым навучальным годзе працягваць вывучэнне матэрыялаў XXIV з'езда КПСС.

На заключных занятках былі заслуханы два даклады. Выкладчыца кафедры грамадскіх дысцыплін Р. А. Міхневіч прачытала даклад на тэму «Перспектывы развіцця народнай гаспадаркі, культуры і навукі ў новай пяцігодцы».

Старшая выкладчыца кафедры рускай мовы О. П. Вадэйка зрабіла даклад на тэму «Мінск ад з'езда да з'езда».

* * *

Два дні працягваўся гарадскі навукова-метадычны семінар выкладчыкаў, навучаючых студэнтаў-іншаземцаў рускай мове.

Семінар адкрыла старшыня гарадскога навукова-метадычнага бюро па пытаннях выкладання рускай мовы іншаземцам, загадчык кафедры падрыхтоўчага факультэта дацэнт Т. П. Плешчанка.

У рабоце семінара прыняла ўдзел загадчык сектара стылістыкі Навукова-метадычнага цэнтра пры МДУ імя М. В. Ламаносава дацэнт А. М. Васільева, якая выступіла з дакладамі: «Градуіраванае чытанне літаратуры студэнтамі-іншаземцамі» і «Стылістыка ў выкладанні рускай мовы іншаземцам».

Выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры рускай мовы нашага універсітэта, Беларускага політэхнічнага інстытута і іншых навучальных устаноў горада з вялікай цікавасцю праслухалі даклады, абмеркавалі іх і абмяняліся вопытам работы.

**Г. УЛАДЗІМІРАЎ.**

# ПЕРСПЕКТЫВЫ БЯГУЧАЙ ПЯЦІГОДКІ

За гады восьмай пяцігодкі Беларускі дзяржаўны універсітэт дасягнуў значных поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па сучасных галінах вытворчасці, навукі і асветы, дабіўся павышэння ўзроўню вучэбнага працэсу і камуністычнага выхавання студэнтаў. Калектывы кафедр і лабараторый здзейснілі даследаванні многіх праблем у галіне прыродазнаўчых і грамадскіх навук, усямерна ўмацоўвалі сувязь навукі з практыкай камуністычнага будаўніцтва. Дасягнутыя поспехі абумоўлены ў пэўнай меры вялікім будаўніцтвам і пашырэннем вучэбна-матэрыяльнай базы, забеспячэннем вучэбных і навуковых лабараторый сучасным абсталяваннем, што дазволіла лепш паставіць вучэбную работу і навуковыя даследаванні.

Калектыў універсітэта з пачуццём глыбокага разумення дзяржаўнай адказнасці ставіць перад сабой задачу ў дзевятай пяцігодцы сканцэнтраваць галоўную ўвагу на выкананні Дырэктыў XXIV з'езда КПСС аб удасканаленні падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з навукова-тэхнічным прагрэсам. Гэта значыць: усямерна павышаць узровень вучэбнага працэсу і камуністычнага выхавання студэнтаў, іх паспяховасць, забяспечыўшы навуковы і ідэйна-тэарэтычны рост навуковых кадраў, пашыраць тэматыку навуковых даследаванняў і ўмацоўваць сувязь навукі з вытворчасцю.

Улічваючы імклівыя тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу, у дзевятай пяцігодцы будзе ўдасканальвацца універсітэцкае абсталяванне, зменяцца яго структура, змест, арганізацыйныя формы і метады навучання.

Намячаецца павялічыць прыём студэнтаў на ўсе формы навучання з 2950 у 1971 годзе да 3575 чалавек у 1975 годзе ў асноўным за кошт арганізацыі навучання па новых і пашырэння падрыхтоўкі па існуючых спецыяльнасцях, такіх, як механіка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, правазнаўства і іншыя. У сувязі з гэтым трэба нястомна ўдасканальваць прыём і паляпшаць адбор ва універсітэт найбольш падрыхтаванай і працавітай моладзі.

Значна больш прыме рабочай, калгаснай моладзі і дэмабілізаваных з Савецкай Арміі воінаў падрыхтоўчае аддзяленне. Да 1974 года яго кантынгент складзе каля 20 працэнтаў ад ліку прымаемых на дзённае навучанне.

Настойліва вылучаецца на першы план задача далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў шляхам паляпшэння агульнатэарэтычнага ўзроўню выкладання, удасканалення вучэбнай і вытворчай практыкі, авалодання студэнтамі сучаснымі дасягненнямі навукі.

Адным з важнейшых аспектаў навуковай арганізацыі навучальнага працэсу з'яўляецца вызначэнне аб'ёму патрабаванняў да будучага спецыяліста. Каб вызначыць гэтыя патрабаванні, неабходна каардынаваць работу факультэтаў з прамысловымі прадпрыемствамі, навукова-даследчымі ўстановамі, для якіх рыхтуюцца спецыялісты. Задача навукова-педагагічных работнікаў заключаецца ў тым, каб непарыўна авалодваць навуковымі дасягненнямі і ў навучальным працэсе даводзіць да студэнтаў неабходны аб'ём і канкрэтны змест навуковых ведаў па спецыяльных і сумежных дысцыплінах. Важна ўсямерна ўдасканальваць навукова-метадычнае майстэрства навучання, не дапускаць дубліравання вучэбнага матэрыялу ў курсах і перагрузкі студэнтаў. На ўсіх факультэтах і кафедрах неабходна ўзмацніць навукова-метадычную работу па вызначэнню аб'ёму і зместу адукацыі па кожнай спецыяльнасці з тым, каб кожны спецыяліст, закончыўшы універсітэт, мог творча выконваць свае вытворчыя функцыі на ўзроўні патрабаванняў сучаснай навукі, тэхнікі і культуры.

У навучальным працэсе неабходна шырэй прымяняць тэхнічныя сродкі навучання, а таксама новыя метады выкладання, устанавіць строгі кантроль за работай і паспяховасцю студэнтаў, сачыць за прывіццём ім навыкаў планамернай, рытмічнай вучобы, лепш арганізоўваць іх самастойную работу, якая інтэнсіўна развівае мысленне і творчыя здольнасці.

Важную ролю ў адукацыі і выхаванні студэнтаў мае фарміраванне ў іх навуковага, марксісцка-ленінскага светапогляду, выхаванне высокай камуністычнай свядомасці. Галоўнай задачай кафедр грамадскіх навук і спецыяльных кафедр з'яўляецца ўзбраенне студэнтаў марксісцка-ленінскім разуменнем грамадскага развіц-

*(Працяг на 2-й стар.)*

# ПЕРСПЕКТЫВЫ БЯГУЧАЙ ПЯЦІГОДКІ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

ця і канчатковай мэты рабочага класа і ўсіх працоўных — пабудовы камуністычнага грамадства, шырокае прымяненне найбольш эфектыўных форм і метадаў марксісцка-ленінскай падрыхтоўкі і камуністычнага выхавання, выпрацоўка ў будучых спецыялістаў умення актыўна змагацца з выдазкамі буржуазнай і рэвізіяністкай ідэалогіі.

Педагагічныя калектывы факультэтаў сумесна з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі павінны забяспечыць усебаковае развіццё асобы кожнага маладога чалавека, актыўна выхоўваць камуністычную мараль, павышаць культуру студэнтаў. Доўг усіх работнікаў факультэтаў — дапамагчы студэнтам разумна выкарыстоўваць свой вольны час для духоўнага і фізічнага ўдасканалення.

Больш поўнаму задавальненню ўзрослых культурных запатрабаванняў студэнтаў, развіццю інтарэсу да мастацкай творчасці паслужыць шырокае знаёмства з багацейшай культурнай спадчынай нашай краіны, развіццё масавай мастацкай самадзейнасці, агляды, конкурсы, выстаўкі, арганізацыя разумнага адпачынку моладзі ў інтэрнатах.

Неабходна сістэматычнае займацца ідэалагічнай работай, павышаць узровень лекцыйнай прапаганды сярод студэнтаў, навуковых работнікаў, рабочых, служачых, арганізаваць глыбокае вывучэнне ўсімі студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта матэрыялаў і дакументаў XXIV з'езда КПСС.

Значная ўвага будзе звернута на паляпшэнне работы па падборы, расстаноўцы, падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў. Намечан шэраг мерапрыемстваў па паляпшэнню падбору кандыдатаў у аспірантуру, куды будуць у першую чаргу залічвацца найбольш здольныя да навуковай і педагагічнай дзейнасці. У сувязі з гэтым неабходна аказваць усямерную дапамогу студэнтам ў аваладанні навыкамі правядзення навуковых даследаванняў і найбольш здольных рэкамендаваць у аспірантуру. Варта павысіць узровень дысертацыйных работ аспірантаў і адказнасць навуковых кіраўнікоў за іх падрыхтоўку. Асаблівая ўвага ў падрыхтоўцы аспірантаў будзе звернута на аваладанне імі марксісцка-ленінскай філасофіяй — метадалогіяй сучаснай навукі, набыццё навыкаў прымянення яе ў навуковых даследаваннях і ў аналізе з'яў грамадскага жыцця, а таксама на пытанні педагогікі і псіхалогіі з далейшым праходжаннем імі педагагічнай практыкі.

Больш увагі будзе ўдзелена павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў шляхам камандзіравання на факультэты павышэння кваліфікацыі і стажыроўку на перадавых прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемствах, у вядучых вну, навукова-даследчых установах.

Значна ўзрасце падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі—дактароў і кандыдатаў навук.

У бягучай пяцігодцы прыкметна пашырыцца аб'ём і тэматыка навуковых даследаванняў па фундаментальных тэарэтычных і эксперыментальных праблемах, а таксама тэматыка гаспадарча-дагаворных работ. Да навукова-даследчай і гаспадарча-дагаворных работ намечана больш далучаць студэнтаў.

З мэтай комплекснага рашэння навуковых праблем плануецца адкрыць у 1971 годзе навукова-даследчы інстытут фізічных праблем, у 1973 — інстытут матэматыкі, у 1974-75 гг. — інстытуты хіміі і біялогіі.

У цяперашняй пяцігодцы прадугледжваецца ўмацаваць і расшырыць матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта: запланавана будаўніцтва вучэбных карпусоў і навукова-даследчых лабараторый, спартыўных баз і жылога фонду для студэнтаў і выкладчыкаў, папаўненне сучасным вучэбным і навуковым абсталяваннем. Будаўніцтва будзе весціся некалькімі чэргамі і ў перспектыве разлічана на 10—15 год.

На базе вучэбна-вопытнай гаспадаркі «Шчомысліца» па генеральнаму плану будзе пабудаван вучэбны корпус біялагічнага факультэта, два дзевяціпавярховыя будынкі інстытута фізічных праблем і інстытута матэматыкі, абсерваторыя, бібліятэка на 750 тысяч тамоў, сталовая, 108-кватэрны жылы дом, паліклініка, спартыўны комплекс, студэнцкі інтэрнат.

Навукова-педагагічныя работнікі, супрацоўнікі, студэнты і аспіранты універсітэта ўсведамляюць не толькі дасягнутыя поспехі, але і складаныя задачы, на рашэнні якіх неабходна сканцэнтраваць увагу. Галоўная з іх, пастаўленая Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады,— развіваць вышэйшую адукацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, пастаянна працаваць над пытаннямі павышэння якасці і паляпшэння ідэйна-палітычнага выхавання будучых спецыялістаў, сістэматычна ўдасканальваць навуковую арганізацыю вучэбнага працэсу.

Дырэктывы XXIV з'езда КПСС устанаўліваюць заданне — падрыхтаваць за пяцігоддзе прыкладна 9 мільёнаў спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, звярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на падрыхтоўку спецыялістаў па новых напрамках навукі і тэхнікі для перспектыўных галін вытворчасці. Задача заключаецца ў тым, каб значна актывізаваць усё навуковае, вучэбнае і ідэйнае жыццё універсітэта, які прызван унесці важкі ўклад у стварэнне матэрыяльных і духоўных асноў камунізму.

**В. ДАЛГАРУКАЎ,**
**начальнік вучэбнага аддзела.**

**БДУ — ІМЯ ГАНАРОВАЕ**

# ПАМЯЦЬ НАРОДНАЯ

**(КАЛІНКАВІЧЫ — МАЗЫР)**

На плошчы перад райкомам партыі — жыхары горада. Дзеці, моладзь, сталыя людзі. Іх паклікала сюды памяць аб мінулым, абавязак, сумленне. Пачынаецца мітынг, прысвечаны Дню Перамогі. І гучаць звычайныя словы аб незвычайных людзях і падзеях...

Герой Савецкага Саюза генерал-маёр Аляксандр Васільевіч Кірсанаў камандаваў 61-й дывізіяй, якая вызваляла горад Калінкавічы ад фашысцкай нечысці. Генерал-маёр запасу Шарамет быў начальнікам штаба той жа дывізіі. Генералы — ганаровыя жыхары горада Калінкавічы...

Генерал Кірсанаў гаварыў мала. Гаварыў з горыччу і трывогай. ...Не трэба новай трагедыі. Беражыце мір, як сваё ўласнае жыццё. Беражыце яго, пакуль б'ецца сэрца, жыве памяць і розум...

Нашы матацыклісты са сцягамі — на чале калоны. На вадзіцелях — белыя рубашкі, цераз плячо — чырвоныя стужкі з надпісам «БДУ-50». Ішлі дзвюма калонамі. Адна паварочвае ў горад, другая — у бок лесу. У Калінкавічах ёсць брацкая магіла, дзе пахавана 10 Герояў Савецкага Саюза. Гарачыя і крывапралітныя ішлі тут баі...

Ля брацкай магілы — ганаровая варта. Кладуцца вянкі, веснавыя кветкі. Апусціўшы нізка галаву, стаіць на каленях у глыбокай сумоце бронзавы салдат. І штосьці ад бронзавага салдата ёсць і на тварах людзей —суровае, мужнае, сумнае...

Асобнай групай стаяць ветэраны. У праменнях сонца пераліваюцца ордэны і медалі. Калі б можна было прачытаць думкі былых воінаў, як усхвалявана і трывожна забілася б сэрца! Аб чым жа думаюць гэтыя людзі? Можа аб тым, каго засыпалі сваёй і чужой зямлёй, можа аб ранах, што ўсё больш даюць аб сабе ведаць, ці аб тым, што яшчэ не зроблена... У іх сумныя вочы і твары. Не, не ўсякія раны гоіць час, не ўсё забывае сэрца. І калі забудзе адзін чалавек, народ не забудзе ніколі. Бо памяць яго — яго гісторыя.

Я падышоў да чалавека невысокага росту ў форме чыгуначніка. Усе грудзі яго — у ордэнах і медалях. Прашу дазволу зрабіць здымак. Ён паклікаў яшчэ двух, таксама ў форме чыгуначнікаў і таксама са шматлікімі ўзнагародамі.

...Фёдар Іванавіч Варанцоў ваяваў на 1-м Беларускім. Вызваляў родны горад. Цяпер працуе начальнікам вакзала. Пётр Паўлавіч Данілюк прайшоў па роднай Беларусі і чужых землях з байцамі 2-га Украінскага фронту. Спачатку ён працаваў начальнікам вакзала, цяпер — пенсіянер. Ягор Мікітавіч Кусянок, былы воін 2-га Украінскага фронту, працуе начальнікам штаба грамадзянскай абароны раёна.

У іх адзін лёс, адны ўспаміны...

Фёдар Іванавіч паказвае на поле, зеленаючае рунню, і гаворыць: «Тут ляжалі нашы хлопцы. Вельмі многа нашых...».

Цяпер поле корміць людзей хлебам і зрэдку напамінае ім аб мінулым вострымі чорнымі кавалкамі металу — іржавымі слядамі смерці...

**(Працяг на 4-й стар.)**



* * *

*НА ЗДЫМКУ: адзін з удзельнікаў агітпрабегу Герой Савецкага Саюза генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў гутарыць з жыхарамі сяла Аляксандраўка Калінкавіцкага раёна, якое ён вызваляў ад гітлераўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

## ГОД ПЛЁННЫ, ТВОРЧЫ

У Беларусі і далёка за яе межамі вядомы калектывы мастацкай самадзейнасці БДУ. Штогод іх з радасцю сустракаюць у вялікіх гарадах і маленькіх вёсках, у сельскіх клубах і на будоўлях. У сёлетнім навучальным годзе ўдзельнікі народных калектываў—харавой капэлы, ансамбля танца «Крыжачок», аркестра народных інструментаў, а таксама эстраднага аркестра «Спін» далі шмат канцэртаў. Гомель, Гродна, Навапалацк, Салігорск, Дзяржынск, Светлагорск — гэта далёка не поўны пералік гарадоў, дзе выступалі студэнты. А на міжрэспубліканскім конкурсе студэнцкіх самадзейных калектываў «Ювентус-70» наша харавая капэла заваявала з трох два ганаровыя прызы.

Сёлетнія выступленні калектывы мастацкай самадзейнасці завершаць у Рызе, дзе з 8 па 11 ліпеня будзе праходзіць традыцыйнае свята песні і танца студэнтаў вну нашай краіны. Удзел у свяце прымуць народная харавая капэла і народны ансамбль танца «Крыжачок». У праграму іх выступленняў увайшлі творы беларускіх народных песень і танцаў, твораў савецкіх кампазітараў. Цяпер самадзейныя артысты рыхтуюцца да выступлення, развучваюць абавязковы рэпертуар свята. Спадзяемся, што і на гэты раз ім будзе спадарожнічаць поспех.

**Ф. САНІН.**

# ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

**(Працяг. Пачатак у №№ 10, 21).**

Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла дыпломамі першай ступені:

**В. Іконнікава, В. Скараход** (5 курс, фізфак) за работу «Разлік хвалевых функцый і спектра ніжніх узроўняў нячотных ізатопаў па звышцякучай мадэлі ядра». Навуковы кіраўнік — **В. Кнацько.**

**В. Мадрынскага** (5, фізфак) — «Некаторыя пытанні мадэліравання выпраменьваючых сістэм». Навуковы кіраўнік — **К. С. Адзярыха.**

**Ю. Станкевіч** (5, фізфак) — «Аб структуры ударных хваль у бінарнай сумесі». Навуковы кіраўнік — **В. В. Пастушэнка.**

**Б. Івенскую** (5, фізфак) — «Да разліку характарыстык ОКГ з улікам структуры МОД». Навуковыя кіраўнікі — **Э. І. Віткін, Т. Л. Перальман.**

**М. Ельяшэвіча** (5, фізфак) — «Прымяненне ўраўнення Ліувіля да задачы тэорыі рассейвання». Навуковы кіраўнік — **А. Х. Фрыдман.**

**В. Алатырцаву, Д. Чарняхоўскага** (5, фізфак) — «Змяненні шчыльнасці дыслакацый у монакрысталах вісмуту і яго сплаваў пад дзеяннем ультрагуку». Навуковы кіраўнік — **В. М. Анішчык.**

**В. Сярэбранікава** (5, фізфак)—«Некаторыя даследаванні электралюмінесцэнцыі крыніц на аснове арсеніду галію». Навуковы кіраўнік — асістэнт **І. С. Монак.**

**А. Заікіна** (5, фізфак) — «Спектр энергетычных узроўняў сістэмы тоесных часцінак». Навуковы кіраўнік — **Г. С. Круглік.**

**Н. Голубева** (5, фізфак) — «Даследаванне ВАХ, апраменненага хуткімі нейтронамі». Навуковы кіраўнік — **А. В. Латышаў.**

**Л. Цыганок** (5, фізфак) — «Бескантактныя метады вымярэнняў электрычных параметраў паўправадніковых матэрыялаў». Навуковы кіраўнік — кандыдат фізіка-матэматычных навук **М. В. Бортнік.**

**В. Ноздрына, В. Кузняцова** (5, фізфак) — «Даследаванне ўплыву апраменьвання на электрафізічныя ўласцівасці крэмнію». Навуковы кіраўнік — дацэнт **П. Лугакоў.**

**Т. Семянчук** (5, фізфак) — «Фотаправадзімасць монакрысталаў LaAs, вырашчаных з пераахаладжаных расплаваў». Навуковы кіраўнік — асістэнт **Э. Е. Радоўскі.**

**А. Уласава** (5, фізфак) — «Прымяненне знешніх форм у ОТО». Навуковы кіраўнік — прафесар **А. Е. Левашоў.**

**М. Шандаровіча** (5, фізфак) — «Тэарэтычны канфармацыйны аналіз гліцыл — L прапіл — L лейцыл-гліцыну». Навуковы кіраўнік—**С. Г. Галакціёнаў.**

**Л. Крывец** (5, фізфак) — «Электрычныя ўласцівасці фасфіду індыю n-тыпу». Навуковы кіраўнік — **В. Вількоцкі.**

**Н. Паклонскага** (5, фізфак) — «Уплыў апраменьвання на неаднародныя крышталы арсеніду галію». Навуковы кіраўнік — ст. выкладчык **В. Ф. Стэльмах.**

**М. Лукашэвіча** (5, фізфак) — «Устаноўка для вывучэння паўправадніковых дыёдаў пры высокіх узроўнях інжэкцыі». Навуковы кіраўнік — **А. М. Янчанка.**

**Т. Эльперына** (5, фізфак) — «Гідрадынамічныя ўраўненні для сістэм часцінак з кулонаўскім узаемадзеяннем». Навуковы кіраўнік — **Т. Л. Перэльман.**

**Л. Кардаш** (5, фізфак) — «Размеркаванне святла ў глыбокіх слаях асяроддзя з адвольнай матрыцай рассеяння». Навуковы кіраўнік — **Э. П. Зэге.**

**В. Міхайлава** (5, фізфак) — «Параўнанне лічбаў у СОК». Навуковы кіраўнік — **М. К. Буза.**

**А. Бандарэнка** (5, матфак) — «Аб бясконцых прымітыўных групах падстановак». Навуковы кіраўнік — дацэнт **Р. І. Тышкевіч.**

**С. Гарохавік** (5, матфак)—«Пабудова адбіццяў у адной гульні з трыма ўдзельнікамі». Навуковы кіраўнік — **Р. І. Кірыянава.**

**Е. Рабіновіча** (5, матфак) — «Аб тэарэме Жардана». Навуковы кіраўнік — дацэнт **Р. І. Тышкевіч.**

**А. Міхлеса** (5, матфак) — «Бясконцыя простыя падгрупы абмежаванай сіметрычнай групы, аб транзітыўных падгрупах абмежаванных сіметрычнай групы». Навуковы кіраўнік — дацэнт **Р. І. Тышкевіч.**

**С. Котаву** (5, матфак) — «Ірацыянальнасць значэнняў некаторых трансцэндэнтных функцый». Навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук **В. Г. Спрынджук.**

*(Працяг на 4-й стар.)*

# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ № 4

«У СІСТЭМЕ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДЭМАКРАТЫІ ВАЖНАЕ МЕСЦА ЗАЙМАЮЦЬ ОРГАНЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ, У РАБОЦЕ ЯКІХ ЦЯПЕР ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ МІЛЬЁНЫ РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ, СЛУЖАЧЫХ,—АДЗНАЧАНА Ў СПРАВАЗДАЧНЫМ ДАКЛАДЗЕ ЦК КПСС XXIV З'ЕЗДУ ПАРТЫІ. — ПАРТЫЯ І НАДАЛЕЙ БУДЗЕ КЛАПАЦІЦЦА АБ ТЫМ, КАБ ЛЕНІНСКІЯ ІДЭІ АБ ПАСТАЯННЫМ І ДЗЕЙСНЫМ КАНТРОЛІ З БОКУ ШЫРОКІХ МАС НЯЎХІЛЬНА ПЕРАТВАРАЛІСЯ Ў ЖЫЦЦЁ».

## *ВУЧАЦЦА ПРАЖЭКТАРЫСТЫ*

Камітэт камсамола і група народнага кантролю універсітэта правялі семінар-нараду камсамольскіх пражэктарыстаў. З дакладам «Аб стане работы і задачах «Камсамольскага пражэктара» ва універсітэце» выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола У. Кузьмін[у]. Старшыня універсітэцкай групы народнага кантролю Я. М. Тагуноў расказаў аб формах і метадах дзейнасці пражэктарыстаў, аб важнасці ўзаемадзеяння з групамі народнага кантролю і грамадскімі кантралёрамі прафсаюзных арганізацый універсітэта і факультэтаў.

Вопытам работы штаба «Камсамольскага пражэктара» фізічнага факультэта падзяліўся начальнік штаба В. Таранчук і начальнік штаба «КП» факультэта прыкладной матэматыкі В. Яравенка.

В. а. начальніка штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта І. Ігнаценка паведаміў аб рашэнні камітэта камсамола правесці агляд-конкурс друкаваных органаў штабаў «Камсамольскага пражэктара» факультэтаў.

**В. АРЛОЎ.**

## ПРЫЗНАНЫ ЛЕПШЫМІ

**ПАДВЕДЗЕНЫ** вынікі агляду сродкаў галоснасці ў рабоце факультэцкіх груп народнага кантролю. Агляд паказаў, што амаль ва ўсіх факультэцкіх групах народнага кантролю ёсць спецыяльныя стэнды, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб рабоце народных кантралёраў: планы работы, матэрыялы праведзеных праверак, паведамленні аб мерах, прынятых па ўхіленню ўскрытых недахопаў, і г. д.

Старшыні і члены груп народнага кантролю выступаюць на партыйных, прафсаюзных сходах і пасяджэннях саветаў факультэтаў з матэрыяламі праведзеных праверак. На старонках універсітэцкай шматтыражнай газеты расказалі аб зробленай рабоце старшыні груп народнага кантролю біялагічнага факультэта А. І. Сцефановіч, фізічнага — Н. М. Хаўратовіч, гістарычнага — М. Ф. Піліпенка і журналістыкі — А. Г. Слука.

Разам з тым агляд паказаў, што ў групах народнага кантролю АГЧ, біялагічнага і філалагічнага факультэтаў укараненню сродкаў галоснасці ў паўсядзённую работу народных кантралёраў не было ўдзелена дастатковай увагі.

І ўсё ж, падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што правядзенне агляду актывізавала работу факультэцкіх груп народнага кантролю. Яны сталі больш шырока і поўна інфармаваць калектыў аб сваёй дзейнасці.

Па прадстаўленню журы агляду універсітэцкая група народнага кантролю прысудзіла I месца групе народнага кантролю фізічнага факультэта (старшыня Н. М. Хаўратовіч), II месца — групе народнага кантролю юрыдычнага факультэта (старшыня П. Я. Грынкін) і III месца — групе народнага кантролю гістарычнага факультэта (старшыня М. Ф. Піліпенка).

Камітэт народнага кантролю Кастрычніцкага раёна г. Мінска аб'явіў Н. М. Хаўратовіч, П. Я. Грынкіну і М. Ф. Піліпенка падзяку з занясеннем у асабістую справу.

**Я. ТАГУНОЎ,**
старшыня ГНК універсітэта.

## КАРЫСНЫ ДАПАМОЖНІК

Выдавецтвам БДУ выпушчана «Памятка народнаму кантралёру». У ёй падабран матэрыял у дапамогу народным кантралёрам нашага універсітэта.

Памятка адкрываецца прывітальным пісьмом ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР актывістам народнага кантролю СССР у сувязі з 50-годдзем утварэння органаў кантролю ў Савецкай дзяржаве. У пісьме дадзена высокая ацэнка дзейнасці органаў народнага кантролю і выказана цвёрдая ўпэўненасць у тым, што работнікі органаў народнага кантролю будуць і надалей беззапаветна служыць вялікай справе будаўніцтва камунізму. Змешчаны таксама вытрымкі з «Палажэння аб органах народнага кантролю ў СССР» і два раздзелы Палажэння, якія датычаць асноўных задач органаў народнага кантролю, а таксама арганізацыі і дзейнасці груп і пастоў народнага кантролю.

Памятка змяшчае прыкладны пералік пытанняў, якімі павінны займацца групы народнага кантролю БДУ, план работы універсітэцкай групы народнага кантролю на 1971 год, каляндарны план і тэматыку лекцый у «Школе народных кантралёраў» універсітэта, а таксама звесткі аб тым, якую літаратуру аб народным кантролі карысна прачытаць членам груп, дзе і калі яны могуць сустрэцца з членамі бюро універсітэцкай групы народнага кантролю і атрымаць кансультацыі па пытаннях савецкага права.

Выданне памяткі будзе садзейнічаць актывізацыі работы кантралёраў нашага універсітэта і тым самым паляпшэнню работы на ўсіх участках у нашым шматтысячным калектыве, які ідзе насустрач свайму паўвекавому юбілею.

**Я. ЧАЙКОЎ.**

## «КП» ПА ТЭЛЕБАЧАННЮ

На факультэце журналістыкі рэгулярна вядуцца вучэбныя тэлеперадачы. Неяк студэнт III курса Валодзя Трусаў выказаў думку, што можна было б зрабіць рэйд у інтэрнаце па агляду санітарных умоў і падрыхтаваць сатырычную перадачу.

Рэйдавая брыгада «КП» разам з групай народнага кантролю зрабіла шмат здымкаў, асабліва ў тых пакоях, дзе жывуць хлопцы. Камендант інтэрната паведаміў аб фактах парушэння распарадку дня, дрэнным дзяжурстве асобных студэнтаў. На падставе сабранага матэрыялу і была зроблена сатырычная тэлеперадача. Вострыя эпіграмы, сатырычныя і гумарыстычныя тэкстоўкі вельмі добра адпавядалі шматлікім здымкам, на якіх красамоўна была адлюстравана неахайнасць, безгаспадарчасць некаторых студэнтаў. Тэлеперадача, якая ішла 10 хвілін, сабрала шмат гледачоў і была прыхільна сустрэта ў студэнцкім асяроддзі. Матэрыялы тэлеперадачы з'явіліся тэмай для сур'ёзнай размовы ў дэканаце, на партыйным і камсамольскім бюро.

Рэдкалегія «КП» факультэта і група народнага кантролю вырашылі зрабіць цыкл тэлеперадач. Яны не абавязкова ўсе будуць крытычныя. Наступная перадача расскажа, як жывуць у інтэрнаце дзяўчаты факультэта журналістыкі, потым будзе сабран матэрыял аб жыцці студэнтаў другіх факультэтаў, зроблен параўнаўчы аналіз.

Ёсць меркаванне вывучыць адначынак студэнтаў, паказаць, як яны рыхтуюцца да экзаменаў.

Падобныя тэлеперадачы маюць выхаваўчае значэнне, а таксама дапамагаюць збіраць канкрэтны матэрыял аб жыцці і вучобе студэнтаў факультэта.

**А. СЛУКА,**
старшыня групы народнага кантролю журфака.

# *З ПАСТАНОВЫ ГРУПЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ БДУ*

## *ПА ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ РАБОТЫ БУФЕТАЎ І СТАЛОВЫХ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ*

Заслухаўшы інфармацыю кіраўніка сектара быту групы народнага кантролю І. А. Сакалова і памочніка санітарнага ўрача Р. І. Прымаковай аб выніках праверкі сталовых і буфетаў ва універсітэце, група народнага кантролю адзначае, што ў рабоце сталовых і буфетаў, абслугоўваючых супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, выяўлены наступныя недахопы:

1. **Па буфеце інтэрната № 3** (буфетчыцы Л. Н. Дзмітрыева і Е. С. Капузава):

— смятана і салат з квашанай капусты захоўваюцца ў вёдрах з абабітай эмаллю;

— электратытан не працуе;

— прыбіральны інвентар не прамаркіраваны;

— рэжым мыцця пасуды не падтрымліваецца;

— прапановы СЭС не выконваюцца.

**Па буфеце фізічнага факультэта** (буфетчыца Р. А. Кульпановіч):

— халадзільныя шкафы няспраўныя. Усе прадукты, якія хутка псуюцца (малако, кефір, заварныя піражныя), захоўваюцца без холаду;

— у складскіх памяшканнях беспарадак, тара не вывезена. смеццязборнікі перапоўнены, спецадзенне захоўваецца навалам;

— рэжым мыцця пасуды не падтрымліваецца.

**Па буфеце і сталовай хімкорпуса** (загадчык вытворчасці А. К.



Карпенка, адміністратар О. Е. Жураўская):

— не працуе вентыляцыя ў варачным цэху;

— няспраўная праціračная машына;

— малочныя прадукты захоўваюцца без холаду.

**Па буфеце галоўнага корпуса** (адміністратар А. С. Яцук):

— не працуе вентыляцыя;

— у халадзільнай камеры не падтрымліваецца таварнае суседства: побач з сырым мясам знаходзіцца сметанковае масла для халодных закусак;

— тэмпература другіх страў на раздачы недастатковая.



**Па буфеце філалагічнага корпуса** (буфетчыца З. А Харлампові́ч):

— пасудамыечная і склад сумешчаны і ўтрымліваюцца ў антысанітарным стане;

— кухонны інвентар своечасова не прамываецца і захоўваецца пад сталом;

— тара своечасова не вывозіцца;

— рэжым мыцця пасуды не падтрымліваецца.

2. Здраўпункт універсітэта вельмі рэдка праводзіць праверку санітарнага стану сталовых і буфетаў універсітэта.



3. Камісія грамадскага кантролю мясцовага камітэта і прафсаюзнага камітэта ў апошні час аслабіла свой кантроль за работай буфетаў і сталовых ва універсітэце. У правядзенні кантрольных мерапрыемстваў гэтыя камісіі не падтрымліваюць неабходнага кантакту з сектарам быту універсітэцкай групы народнага кантролю.

З мэтай ліквідавання адзначаных недахопаў група народнага кантролю ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прасіць рэктара універсітэта А. Н. Сеўчанку даць указанне АГЧ аб правядзенні неабходнага рамонту падсобных памяшканняў буфета філалагічнага факультэта; аказаць садзеянне ў набыцці і ўстаноўцы смажачнага шкафа для буфета галоўнага корпуса.

2. Інжынеру па вентыляцыі Н. М. Дубіцкаму да 15 чэрвеня 1971 г. прадставіць у групу народнага кантролю падрабязную інфармацыю аб стане вентыляцыі сталовых хімічнага і галоўнага карпусоў і прапановы па ліквідаванню недахопаў.

3. Звярнуць увагу загадчыка здраўпункта універсітэта Ф. П. Рэзнікавай на неабходнасць правядзення сістэматычных праверак санітарнага стану буфетаў і сталовых ва універсітэце.

4. Прасіць мясцовы і прафсаюзны камітэты універсітэта разгледзець на сваіх пасяджэннях пытанне аб рабоце камісій грамадскага кантролю за работай буфетаў і сталовых і ўказаць на неабходнасць падтрымліваць кантакты ў рабоце з сектарам быту універсітэцкай групы народнага кантролю.

5. Прапанаваць загадчыкам сталовых №№ 10 і 33 і кафэ № 1 гэтую пастанову групы народнага кантролю абмеркаваць на сходах супрацоўнікаў буфетаў і сталовых і намеціць меры па ліквідаванню адзначаных недахопаў.

*Мал. М. Ініна.*

# ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

*(Працяг. Пачатак на 2-й стар.)*

**С. Савельзон** (5, матфак) — «Кіруемасць кампазітных сістэм». Навуковы кіраўнік — прафесар **Р. Ф. Габасаў.**

**В. Юфераву** (5, матфак) — «Рашэнне задачы аб аптымальным размеркаванні памяці паміж рабочымі палямі блокаў і працэдур». Навуковы кіраўнік — **В. С. Айзенштат.**

**М. Дубаву** (5, матфак) — «Стамастычны прынцып максімуму». Навуковы кіраўнік — **М. Ф. Кірылава.**

**Р. Гордзіну** (5, матфак) — «Аналітычныя функцыі ў р-адзічным полі». Навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук **В. Г. Спрынджук.**

**В. Бернік** (5, матфак) — «Эргадычная ўласцівасць лінейна незалежных мнагачленаў». Навуковы кіраўнік — **В. Г. Спрынджук.**

**А. Гілен** (5, матфак) — «Краявыя задачы для кіравання змешанага тыпу». Навуковы кіраўнік — прафесар **Ф. Д. Гахаў.**

**Э. Кавалеўскую** (5, матфак) — «Аб сумесным размеркаванні дробных частак мнагачленаў». Навуковы кіраўнік — **В. Г. Спрынджук.**

**Л. Забела** (5, матфак) — «Аб адной неабходнай і дастатковай умове кіруемасці нестацыянарных сістэм». Навуковы кіраўнік — прафесар **Р. Ф. Габасаў.**

**О. Мельнікава** (5, матфак) — «Групы аўтамарфізмаў кампактных нульмерных груп». Навуковы кіраўнік — прафесар **У. П. Платонаў.**

**А. Вараву** (5, матфак) — «Асобыя інтэгральныя ураўненні з параметрам». Навуковы кіраўнік — прафесар **Ф. Д. Гахаў.**

**Е. Барбашыну** (5, матфак) — «Даследаванне асобых кіраванняў у замкнутых зонах». Навуковы кіраўнік — прафесар **Р. Ф. Габасаў.**

**Б. Мардуховіч** (5, матфак) — «Да праблемы існавання аптымальных кіраванняў». Навуковы кіраўнік — прафесар **Р. Ф. Габасаў.**

**Г. Мацвеева** (5, матфак) — «Аб фінітнай апраксіміруемасці адносна спалучанасці лінейных груп». Навуковы кіраўнік — прафесар **У. П. Платонаў.**

**В. Шуша** (5, фізфак) — «Даследаванне метадам ТСП энергетычнага спектра і параметраў лавушак у монакрысталах крэмнію». Навуковы кіраўнік — **П. Ф. Лугакоў.**

**Т. Прыма, Е. Козел** (5, хімфак) — «Даследаванне сінтэзу і фізіка-хімічных уласцівасцей паўправадніковага злучэння». Навуковы кіраўнік — кандыдат хімічных навук **М. П. Гілевіч.**

**В. Яськова** (5, хімфак) — «Даследаванне тэрмадынамічных уласцівасцей сістэмы медзь-алюміній метадам электрарухаючых сіл». Навуковы кіраўнік — дацэнт **А. А. Вечар.**

**Л. Кірылаву, Л. Жукаву, С. Некрашэвіч** (5, хімфак) — «Сінтэз паўправадніковага злучэння і даследаванне яго фізіка-хімічных уласцівасцей». Навуковы кіраўнік — дацэнт **М. П. Гілевіч.**

**[Працяг будзе].**

# ПАМЯЦЬ НАРОДНАЯ

*(Працяг. Пачатак на 2-й стар.)*

Вечарам мы сустрэліся з рабочымі саўгаса «Галевічы». Клуб быў запоўнен так, што кроку не ступіш. Калі гаварыў генерал Шарамет, цішыня стаяла незвычайная. Пасля яго прамовы доўга не сціхалі апладысменты. Сівы чалавек, кавалер ордэна Славы, падымаўся з месца і апладзіраваў стоячы пасля кожнага выступлення. Твар яго трэба было бачыць, бо апісаць словамі—дарэмная спроба. Вочы ветэрана то ззялі жорсткім бляскам металу, то поўніліся цеплынёй, то глыбокім сумам. Вусны дрыжэлі, быццам імкнуліся вымавіць паўзабытыя імёны і не маглі...

Віншаваць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны прыйшлі піянеры. Калі звонкія дзіцячыя галасы напоўнілі залу, многія калгасніцы паднеслі да твараў хусцінкі... Вечнай загадкай застаецца для розуму жаночае сэрца. Ні адна слязінка не ўпадзе з вачэй у самыя жудасныя моманты, калі, здаецца, усё скончана, і плачуць вочы ад звонкага голасу дзяўчынкі.

І тут прадстаўнікі універсітэта расказалі аб надыходзячым свяце, жыцці студэнтаў. «Землякі» далі канцэрт, які цёпла быў прынят калгаснікамі.

У Калінкавічах мы добра папрацавалі. Выступілі з расказам аб універсітэце, шчыра агітуючы выпускнікоў ва ўсіх школах горада паступаць у БДУ. Сустрэліся з рабочымі звераферми. І тут нашы эстраднікі былі на вышыні. Позна вечарам вярнуліся мы ў гасцініцу. Заўтра чакае нас Мазыр. Ён зусім побач. Усяго 24 кіламетры ад Калінкавіч.

* * *

Стаіць Мазыр на правым беразе Прыпяці. Частка Мазырскай грады, узвышаючыся над Палескай нізінай, надае гораду выгляд своеасаблівы і маляўнічы. «Беларускай Швейцарыяй» любоўна называюць у рэспубліцы горад Мазыр. Сённяшні Мазыр — гэта буйнейшы мэблевы камбінат, завод меліярацыйных машын, ліцейна-механічны завод, завод серыйных дэталей і жалезабетонных вырабаў. Мазыр — гэта буйнейшы ў Беларусі рачны порт. Адсюль воднымі шляхамі ідуць па адрасах краіны кабель фірмы «Мазкабель» і серыйныя дэталі, мэбля і машыны, салігорскія калійныя солі і рэчыцкая нафта, данецкі вугаль і шмат іншых грузаў.

...У Мазыры — свята. Спартыўнае свята, прысвечанае Дню Перамогі. Нас запрасілі ў якасці гасцей.

...У сярэдняй школе некалькі гадзін працягвалася гутарка з выпускнікамі, якую правялі В. А. Баркан і П. Л. Салаў.

А калі вечарам змрок атуліў горад, з адкрытай эстрады гарадскога парку гучалі песні нашых салістаў ансамбля «Землякі» фізічнага факультэта — Валянціна Бутрына, Вячаслава Цішкевіча і Барыса Шпілявога. Студэнтка гістфака Люда Андрэйчанка выканала народныя песні. Першакурсніца факультэта журналістыкі Таня Ягорава з вялікім натхненнем чытала ўрыўкі з паэмы Я. Еўтушэнкі «Брацкая ГЭС» і вершы А. Барто. Гучалі студэнцкія песні ў выкананні студэнтак філфака Ганны Нямковіч, Раі Лось і Тамары Пасюк.

За вячэрай мы павіншавалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны генералаў А. В. Кірсанава, Шарамета і нашага Міхаіла Міхайлавіча, бацькоўскія клопаты і ўвагу якога ў паходзе адчуў на сабе кожны з нас.

Гэта іх свята. Іх дзень у першую чаргу...

**Л. ЕКЕЛЬ.**





НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) студэнты В. Бутрын (фізфак) і Л. Екель (журфак) расказваюць аб сваіх факультэтах выпускнікам 5-й сярэдняй школы г. Калінкавічы; (ніжэй) удзельнікі агітпрабегу на экскурсіі ў калінкавіцкай зверагаспадарцы.

Фота **В. Жука.**

# ПАРА АДПАЧЫНКУ

Лета ўваходзіць у свае правы. Здадзены апошнія залікі, пачаліся традыцыйныя хваляванні сесіі. Чытальныя залы бібліятэк перапоўнены, таропка гартаюцца канспекты, падручнікі пераходзяць з рук у рукі. Згадзіцеся, што цяпер нялёгка знайсці бесклапотнага студэнта. У аўтобусе, у сталовай, на пляжы з ім цяпер заўсёды побач кніга.

Але хутка адыйдуць хваляванні, толькі хіба застануцца ў памяці трапныя жарты сесіі, апошнія недаспаныя ночы.

Затым пакліча лета. І пачнуць збіраць у дарогу свае нешматлікія пажыткі турысты, таямнічая сіла гор пакліча альпіністаў.

Прафком БДУ ўжо надрыхтаваўся прыняць пасланцоў лета. На беразе возера Нарач студэнтаў чакае спартыўна-аздараўленчы лагер на 400 месц. Ён будзе працаваць у дзве змены. Да паслуг студэнтаў блакітныя азёры, экскурсіі па бяскрайніх водных прасторах, цудоўнае паветра.

Цесныя сувязі наладжаны нашым прафкомам з лагерам «Брыганціна» Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Гэты лагер знаходзіцца на беразе Фінскага заліва. Многія студэнты будуць праводзіць свой летні адпачынак у гэтым цудоўным месцы.

Гасцінна расчыняць дзверы дамы адпачынку і санаторыі. Больш 500 чалавек адправяцца ў турысцкія паходы па месцах баявой і працоўнай славы. А ў гарах Каўказа ўжо чуваць задорныя студэнцкія песні. Там размясціўся альпініецкі лагер універсітэта.

Прафкомам будзе выдзелена на летні сезон неабходная колькасць пуцёвак у прафілакторый.

**А. СІНЬКЕВІЧ.**



*Канцэрт для ветэранаў вайны.*
*Спяваюць Р. ЛОСЬ, Г. НЯМКОВІЧ і Т. ПАСЮК.*



Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 734. АТ 08697
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.